Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 30 (174)	21—31 кастрычніка	1934 г.

ЗМЕСТ

Сінаптычны агляд за дэкаду з 21 па 31 кастрычніка 1934 г.

Цыкланічная дзейнасць на працягу ўсёй гэтай дэкады адбывалася ў заходняй Еўропе. Цыклоны рухаліся праз Англію, Іспанію, Скандынавію на Барэнцава і Карскае мора. Усяго па гэтаму напрамку прайшло 3 цыклоны, якія сваім дзеяннем мелі значны ўплыў на пацяпленне ў паўночнай частцы БССР 22-га 25-га і 28-га кастрычніка. У гэтыя дні тэмпература ноччу даходзіла да $+8^0$, $+9^0$.

На працягу ўсёй дэкады тэрыторыя БССР знаходзілася пераважна пад уплывам высокага ціску, які скадаўся з мас кантынентальна-палярнага паветра якое прэабразавалася з марскога палярнага, прыйшоўшага з Атлантычнага акеана.

Першы дзень дэкады тэрыторыя БССР была занята прэжнім марскім палярным паветрам з пераважна яснымі начамі, пахмурнымі днямі і досыць значным сутачным ходам тэмпературы, удзень яна даходзіла да $+10^0$, $+11^0$, а ноччу зніжалася да 0 і $+2^0$.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядаліся мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	9	11	10	9	9	7	7	11	8	6	3	8	—	13	—1	27
	3	Полацк	9	11	11	9	9	7	6	11	8	7	6	8	3	14	—3	27
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Новае-Каралёва	8	10	9	8	8	7	5	9	9	7	5	8	2	13	0	27
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	10	11	10	8	8	7	8	11	9	7	6	8	—	14	2	31
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	9	11	9	7	7	6	7	11	10	7	7	8	3	14	2	26
	16	Менск	10	10	9	7	7	7	6	11	9	6	7	8	3	14	2	25
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	9	10	10	7	8	8	6	10	9	7	6	8	3	14	—	—
	25	Асіпавічы	9	11	10	8	7	9	5	11	10	8	7	9	4	15	1	27
	10	Орша	8	10	10	8	8	7	7	10	10	7	6	8	3	13	1	27
	19	Горкі	7	10	9	9	8	7	7	10	9	6	6	8	3	13	1	21
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	9	10	9	8	7	7	6	10	8	7	7	8	—	15	0	21
	30	Мар.-Сосны	9	10	8	9	6	7	5	11	8	9	7	8	4	15	—1	25
	21	Магілеў	9	11	10	9	8	8	8	10	9	8	8	9	3	15	0	21
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	7	10	10	10	9	9	8	11	10	7	8	9	3	15	2	21
	71	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	8	10	10	8	6	8	5	10	8	6	6	8	4	14	0	27
	32	Жлобін	8	10	10	8	6	9	6	10	9	7	6	8	4	16	1	25
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	9	10	9	7	6	8	6	11	8	8	7	9	4	16	—1	25
	37	Калінкавічы	8	11	8	8	6	—	—	—	—	—	—	—	4	17	0	25
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	45	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	8	10	11	10	9	8	9	11	9	7	7	9	4	17	2	21
	35	Васілевічы	8	11	9	8	6	8	8	11	9	6	6	8	4	17	0	—
	40	Людвінава	8	8	8	7	6	6	8	10	8	8	5	8	5	16	—1	26

назіранняў з 21—31 кастрычніка 1934 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Тэмпература паверхні глебы: Мінімальн.	Тэмпература паверхні глебы: Чысло, калі наглядаўся мінімум	Ападкі ў мм: 21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сума	Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны числы)
79	—	—2	27	1.0	..	..	..	..	..	1.0	1.0	0.2	3.0	..	3.5	туман (23, 25)
74	—	—	—	0.1	0.5	..	..	..	0.5	2.0	..	2.0	1.0	..	6.1	туман (28)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
79	16	—3	21	..	..	..	..	..	..	..	..	..	1.0	..	1.0	туман (22, 27)
72	—	2	31	..	0.1	..	..	..	..	0.4	..	..	..	..	0.5	туман (22, 23)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
77	—	1	24	..	..	..	..	..	0.1	0.1	..	..	..	..	0.2	туман (22, 23)
77	6	2	26	..	0.1	0.2	..	0.1	0 2	..	..	0.3	0.1	..	1.0	туман (22, 23)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	21	0	26	..	..	..	..	..	0.2	0.2	..	..	0.1	0.1	0.6	туман (23) бура (30)
67	—	2	25	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.0	туман (23, 25)
79	13	0	27	..	..	0.1	..	..	..	2.0	..	0.1	..	..	2.2	туман (23, 26)
74	18	0	21	..	..	..	..	..	..	0.1	..	..	0.1	..	0.2	туман (21—31)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
72	—	2	27	..	0.1	..	..	..	0.1	0.1	0.1	..	0.1	0.1	0.6	туман (21, 22)
67	—	—	—	..	..	..	0.1	0.1	0.1	0.3	0.1	0.2	0.3	..	1.2	туман (21, 23)
78	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.4	..	0.4	туман (21, 22)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
74	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.0	туман (21, 22)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
75	21	—2	25	0.1	..	..	0.2	0.1	0.1	..	..	0.1	0.2	0.1	0.9	туман (23) граза (27)
73	—	—	—	..	0.1	..	0.1	0.1	0.1	..	..	..	0.1	..	0.5	туман (21, 22)
74	—	—	—	..	..	..	..	..	0.1	..	..	0.2	..	..	0.3	туман (21, 22)
78	—	—	—	..	..	..	0.1	..	..	..	..	..	0.2	..	0.3	туман (25, 31)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.0	туман (27, 30)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
71	—	—	—	0.3	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.3	туман (21, 30)
64	—	—1	27	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.0	туман (30)
67	—	—	—	..	0.1	0.1	0.4	0.3	0.1	0.1	..	0.1	0.2	..	1.4	туман (22, 23)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў з 21—31 кастрычніка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхновага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса.	SW	4	SW	9	—	8	6	вільготная
	3	Полацк	S	4	S	9	—	8	6	„
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва . .	S	4	S	7	14	8	8	вільготная
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	SW	9	—	8	8	вільготная
	75	Плешчаніцы . . .	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SW	4	SW	9	—	8	6	вільготная
	16	Менск	SW	4	SW	10	—	8	3	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка . . .	SW	4	SW	12	—	6	3	вільготная
	25	Асіпавічы	S	4	S	4	—	8	6	„
	10	Орша	SW	4	SW	12	—	8	6	вільготная
	19	Горкі	SW	4	W	9	13	6	6	„
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў.	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	SW	4	SW	9	—	8	6	вільготная
	30	Мар'іна-Сосны. . .	W	4	W	7	—	—	3	„
	21	Магілеў	SW	4	SE	6	—	7	2	„
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	SW	9	—	8	8	вільготная
	71	Касцюковічы . . .	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	SW	4	SW	9	—	9	9	вільготная
	32	Жлобін	S	2	SW	7	—	8	3	„
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	SW	2	SW	11	—	6	3	вільготная
	37	Калінкавічы. . . .	SE	2	SE	4	—	6	6	„
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	45	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	S	2	SW	7	—	6	3	вільготная
	35	Васілевічы	SE	2	SW	4	—	6	3	„
	40	Людвінава	S	2	S	4	—	8	6	сухая

22-га і 23-га кастрычніка на тэрыторыю БССР насунулася з захаду цёплая і вільготная маса паветра, якая канчаткова стабілізавалася ў кантынентальна-палярнае, у адпаведнасці з чым тэмпература ноччу павысілася да $+8^0$, $+9^0$ і ў дзень да $+13^0$, $+14^0$ з пераважна пахмурным надвор'ем, а таксама з наяўнасцю вялікіх радыяцыйных туманаў, якія ўтрымліваліся месцамі на працягу сутак.

З 24-га па 27-га кастрычніка, дзякуючы ўваходжанню на тэрыторыю БССР, ахаладжанага кантынентальна-палярнага паветра тэмпература панізілася. Ноччу месцамі даходзіла да—1^0 удзень да 8^0, пры моцных радыяцыйных туманах. У паўночнай частцы БССР гэтыя туманы ўтрымліваліся на працягу сутак.

28-га і 29-га кастрычніка на тэрыторыю БССР уступалі масы вільготнага і цёплага марскога-палярнага паветра, у звязку з чым тэмпература павысілася ноччу да $+6^0$, $+8^0$, удзень да $+13^0$, $+14^0$ пераважала поўная воблачнасць з выпадзеннем ападкаў на поўначы.

У апошнія два дні дэкады, па прычыне ўваходжання больш сухога кантынентальна-палярнага паветра тэмпература знізілася ноччу да $+2^0$, $+3^0$ і ўдзень да $+10^0$, $+12^0$.

Такое размеркаванне барычных вобласцей і паветраных мас спрыяла пераважна сухому і цёпламу з туманамі надвор'ю ў гэту дэкаду па ўсёй тэрыторыі БССР.

Фізік Д. Захарык.

Метэаралагічная характарыстыка за 22—31 кастрычніка 1934 г.

Тэмпература паветра ў гэтай дэкадзе трымалася даволі высокая. Спачатку дэкады сярэдняя сутачная т-ра дасягала $+10+11^0$, к 27-му яна панізілася да $+5+8^0$. У наступныя дні зноў назіралася павышэнне т-ры да $+10+11^0$, потым да канца дэкады т-ра зніжалася. Сярэдняя дэкадная т-ра была роўна $+8+9^0$. У параўнанні з нармальнай яна вышэй на $+4+5^0$. Максімальная т-ра вагалася ад $+13$ да $+17$, мінімальная—каля 0^0. Метстанцыя Полацк адзначыла т-ру—3^0.

Ападкаў за гэту дэкаду выпала надзвычайна мала. Некалькі станцый адзначыла поўную адсутнасць ападкаў (Асіповічы, Чэрыкаў, Чэчэрск і Васілевічы). Большасць станцый адзначылі ападкі менш 1 мм. за дэкаду і толькі ў адзінкавых выпадках яны перавышалі 1 мм. (Полацк 6 мм. і Дрыса 3,5 мм.).

У розныя дні, але пераважна 22-га і 23 назіраліся туманы.

Вятры пераважалі Паўднёва-заходнія—сярэдняй хуткасці.

Воблачнасць складала 60—80% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідрамет. характарыстыка з 21—31 кастрычніка 1934 г.

Сухое і адносна цёплае надвор'е справаздачнай дэкады было спрыяючым для правядзення с/гасп. работ як та: уборка карняплодаў і капусты, пераворванне бульбянішча, зяблівае ворыва і інш.

Для вегетацыі азімых жыта і пшаніцы ўмовы надвор'я гэтай дэкады таксама былі спрыяючымі.

В. Стэфановіч.

Агляд навальнічнай дзейнасці за лета 1934 г.

Спачатку чэрвеня месяца навальніцы наглядаліся даволі часта па ўсёй тэрыторыі БССР (у розныя дні).

У паўднёвай частцы асабліва вызначаюцца 6-ае і 9-ае чэрвеня, калі навальнічная дзейнасць была надзвычай развітай. Наступная ўспышка навальнічнай дзейнасці адзначана 11-га па ўсёй БССР, пераважна ў паўночнай яе частцы. Услед за гэтым на працягу дэкады ідзе перыяд амаль зусім без навальніц.

На поўдні навальніцы пачаліся некалькі раней, 19-га і 21-га яны зноў ахапілі ўсю тэрыторыю, прычым у большасці сваей яны былі сільныя і праходзілі разам з выпадзеннем града і ліўневых дажджоў. У канцы месяца навальніц амаль не назіралася.

У жніўні колькасць навальніц значна зменшылася. Большасць станцый адзначалі 2 дні з навальніцамі за месяц (гл. табліцу).

Назіраліся навальніцы ў наступныя дні: у Цэнтральнай зоне БССР—1-га, на поўначы—3-га і па ўсёй тэрыторыі ў перыяд з 10 па 16-ае. У другой палове месяца навальніц амаль не назіралася.

Навальніцы ў жніўні былі значна менш інтэнсіўныя чым у папярэднія месяцы. Найбольш ясную карціну колькасці навальніц па паасобных месяцах летняга перыяда 1934 г. дае наступная табліца.

Калі паглядзім на таблічку прыведзеную ў канцы, то заўважым, што большасць станцый адзначае ў ліпені 5 дзён з навальніцамі, тады як у чэрвені большасць станцый адзначыла толькі 3 дні, у якія назіралася навальнічная дзейнасць. Апроч таго шмат станцый у ліпені колькасць дзён з навальніцамі вызначае лічбай 17 (Церабуты, Пухавіцкага раёну).

Паасобныя перыяды, калі пераважна назіраліся навальніцы ў ліпені вызначыць нельга. Можна толькі адзначыць, што большасць навальніц назіралася з 16-га па 20-ае наогул у другой палове месяца.

Лік дзён з навальніцамі	0	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	17	Сума
Чэрвень																
Лік станцый . .	2	15	16	20	19	8	9	2	—	1	1	—	—	—	—	93
Лік станцый у %	2	16	17	22	20	9	10	2	—	1	1	—	—	—	—	100
Ліпень																
Лік станцый . .	3	7	12	13	11	15	12	11	4	9	6	2	1	1	1	108
Лік станцый у %	3	6	11	12	10	14	11	10	4	8	6	2	1	1	1	100
Жнівень																
Лік станцый . .	7	21	25	22	15	8	4	—	1	—	1	—	—	—	—	104
Лік станцый у %	7	20	24	21	14	8	4	—	1	—	1	—	—	—	—	100

З прыведзенай табліцы бачна, колькі станцый адзначылі адпаведную колькасць дзён з навальніцамі. Такім чынам у чэрвені 2 ст. зусім не адзначылі навальніцы, 15 ст. адзначылі 1 дзень і г. д. Для параўнання паасобных месяцаў гэтыя лічбы выражаны ў $^0/_0{}^0/_0$ ад агульнага ліку станцый, якія давалі назіранні.

Н. Малішэўская.

Некалькі слоў аб нашай рабоце

Бурны рост соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, прамысловасці і транспарта паставілі перад Адзінай Гідраметслужбы БССР неабходнасць своечасовага праракання надвор'я, як на бліжэйшы час, а таксама на больш доўгія перыяды.

Для выканання гэтай адказнай задачы, ў сістэме Гідрометэаралагічнай службы ў 1931 годзе, было арганізована Бюро Надвор'я. Гэта маладая арганізацыя спачатку сваей работы была яшчэ мала вядома Совецкім арганізацыям і прадпрыемствам. У першыя часы асноўным спажыўцом прадукцыі (прагнозаў) Бюро Надвор'я быў паветраны і чыгуначны транспарт, але дзякуючы праведзенай рабоце з кожным годам Бюро Надвор'я ўсё больш і больш становіцца неабходным звеном у сістэме соцыялістычнага будаўніцтва, што бачна з таго, што за 1933 год Бюро Надвор'я выдала розным організацыям каля 6000 даведак, а за 9 м-цаў 1934 г. Аддзел Прагнозаў і інформацый (быўш. Бюро Надвор'я) выдаў 5.796 даведак (у гэту колькасць не ўваходзяць організацыі атрымліваючыя доўгатэрміновыя прагнозы).

Вышэй паказаныя даныя паказываюць наколькі ўзрасла сетка спажыўца ў гэтым годзе. Побач з колькасным ростам

спажыўца паляпшалася і якасць іх абслугоўвання. Калі ўзяць для параўнання два апошнія гады, то карціна стане яснай. Так, у 1933 годзе мы мелі апраўдваемасць прагнозаў у сярэднім за год 82%, а за 9 м-цаў 1934 года 87%.

Для характарыстыкі апраўдваемасці прагнозаў па элементах прывядзем 2 табліцы:

Табліца № 1

1933 год

№№ п/ч	Элементы	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	Год
1	Т-ра паветра (ноччу і днём) . .	89	68	70	82	78	77	86	78	70	82	83	69	78%
2	Воблачнасць . .	92	87	75	87	94	86	95	96	89	99	90	86	90%
3	Ападкі	71	85	63	85	85	75	80	77	91	77	76	83	79%
4	Напрамак вятроў .	87	86	86	79	58	86	84	82	85	79	66	76	80%
5	Сілы вятроў . .	85	73	74	75	83	94	92	84	83	80	92	80	83%
6	Сярэдняя за м-ц .	85	80	74	82	80	84	87	83	84	83	81	79	82%

Табліца № 2

За 9 м-цаў 1934 года

№№ п/ч	Элементы	1	2	3	4	5	6	7	8	9	Год
1	Т-ра паветра (ноччу і днём) . .	56	63	89	82	82	86	92	92	89	81%
2	Воблачнасць . .	85	82	97	96	99	96	98	93	97	94%
3	Ападкі	76	56	72	83	73	80	90	71	80	76%
4	Напрамак вятроў .	85	83	94	85	94	88	87	89	93	89%
5	Сіла вятроў . .	98	98	99	98	99	94	99	94	93	97%
6	Сярэдняе за м-ц .	80	76	90	89	89	89	93	88	90	87%

З гэтых 2-х табліц можна бачыць, што з сакавіка месяца гэтага года апраўдваемасць прагнозаў у параўнанні з гэтымі-ж месяцамі мінулага года ў сярэднім вырасла на 7,2% у адносінах-жа першых двух месяцаў гэтага году назіраецца зніжэнне апраўдваемасці на 4,5%. Прычынамі к зніжэнню паслужылі: няпоўны штат фізікаў—замест 5 чалавек 3, таксама адсутнасць нармальных умоў для работы Бюро Надвор'я ў сувязі з пераездам у другое памяшканне.

Не глядзячы на рад труднасцей ў рабоце Аддзела Прагнозаў і інфармацый усё-ж такі мы маем рост апраўдваемасці ў гэтым годзе ў параўнанні з мінулым годам за 9 м-цаў у сярэднім на 5%. Але слабым звеном у прараканні паасобных элементаў

надвор'я з'яўляюцца і ў гэтым годзе ападкі, апраўдваемасць якіх ніжэй мінулага года на 3%, прычым наогул трэба адзначыць, што процант апраўдваемасці прагнозаў па ападках ніжэй чым па астатніх элементах, як ў мінулым годзе, так і ў гэтым. Гэта абавязвае работнікаў групы Прагнозаў і ў першую чаргу фізікаў, звярнуць больш увагі на гэты ўчастак работы.

Наша прадукцыя мае яшчэ рад недахопаў, яна не зусім удобаварыма для спажыўца і мае некаторую шаблоннасць. Каб знішчыць гэтыя недахопы ў далейшым мы ставім сваей задачай, на аснове павышэння сваіх сінаптычных ведаў і якасці практычнай работы, даць свайму спажыўцу такі прагноз, які-б даў яснае прадстаўленне аб чакаемым надвор'і і ў залежнасці ад гэтага—перабудаваць работу свайго прадпрыемства. Негледзячы на тое, што служба надвор'я БССР яшчэ маладая і работнікі Аддзелаў Прагнозаў і інфармацыі выйшлі з радавых работнікі адзінай Гідраметслужбы БССР і з незначным практычным вытворчым стажам, мы ставім сваей задачай, на аснове аўладання тэхнікай і ўкаранення ў сваю штодзённую работу ўдарніцтва і соцспаборніцтва, давесці апраўдваемасць нашых прагнозаў да 93—95%.

Я. Івашчэнка.

ЗАГАД № 3

па ГК АГМС БССР ад 7/X-34 г.

§ 1.

Заг. мет. ст. Мар'іна-Горка т. Лапко за сістэматычнае п'янства на мет. ст., развал працы, ганенне на тэх. працаўніка мет. ст. тав. Кайцэловіч Л., якая данесла ў ГК АГМС аб п'янстве на мет. ст. пабочных асоб, з працы зняць.

§ 2.

Назіральніка мет. ст. М.-Горка т. Байко за сістэматычнае п'янства на мет. ст. за паддзелку распіскі на атрыманне зарплаты тав. Кайцэловіч і прысваенне яе, з працы зняць.

§ 3.

Тав. Кайцэловіч незаконна зволеную заг. мет. ст. Лапко восстанавіць на працу, аплаціў ёй за вымушаныя прагулы з зарплаты Лапко.

§ 4.

Тав. Нікіфаровічу спец. па мет. сеці тэрмінова выбыць на мет. ст., адстраніць ад працы вышэйуказаных асоб, вытварыць дэталёвую праверку працы і грашовых спраў, перадаў часова метстанцыю т. Кепцю.

§ 5.

Увесь матэрыял расследвання справы аб п'янстве і ганенні на т. Кайцэловіч перадаць пракурору па месцу знаходжання мет. ст. з просбай прыцягнуць да суровай адказнасці т. Лапко, Байко і прычасных к справе асоб.

Нам. нач. УЕГМС Бугаёў.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Друкарня БелАН. Зак. № 355. Гарліт № 6986. Тыраж 600. 10 стар.